**Н. Я. Краўцэвіч,**
настаўнік беларускай мовы
Ліцэя Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта

***Апорны канспект «*Асаблівасці спалучэння лічэбнікаў з назоўнікамі»**

| | |
|---|---|
| 1) алічэбнік ***адзін*** дапасуецца да назоўніка ў родзе, ліку, склоне: | *адзін хлопец, аднаго хлопца, адна дзяўчына, адно дзіця, адны акуляры*; |
| 2) лічэбнікі ***два***, ***абодва***, ***паўтара*** маюць родавыя формы: | *два вучні* (м.р.), *два дрэвы* (н.р.), *дзве сястры* (ж.р.), *абодва браты* (м.р.), *абодва кацяняці* (н.р.), *абедзве дачкі* (ж.р.), *паўтара тыдня* (м.р.), *паўтара вядра* (н.р.), *паўтары старонкі* (ж.р.); |
| 3) пры лічэбніках ***два*** (***дзве***), ***абодва*** (***абедзве***), ***тры***, ***чатыры*** назоўнікі ўжываюцца ў **Н. скл. мн. л.**:<br>астатнія лічэбнікі спалучаюцца з назоўнікамі ў Р. скл. мн. л.: | *два сшыткі, дзве кнігі, абодва настаўнікі, абедзве жанчыны, тры возеры, чатыры месяцы*;<br>*пяць сініц, дваццаць магазінаў, сто сорак восем навучэнцаў*; |
| 4) з лічэбнікамі ***тысяча***, ***мільён***, ***мільярд*** назоўнікі спалучаюцца ў форме Р. скл. мн. л.: | *тысяча пакупнікоў, мільён чалавек, мільярд зорак*; |
| 5) пры ***дробавых*** лічэбніках назоўнік стаіць у Р. скл.: | *пяць восьмых поля, шэсць дзясятых адрэзка, паўтара года, паўтары тоны*; |
| **! Помніце:** калі ў першай частцы дробавага лічэбніка ўжываюцца словы ***дзве***, ***тры***, ***чатыры***, то другая частка мае форму **Н. скл. мн. л.**: *дзве трэція кілаграма, тры пятыя праспекта, чатыры сёмыя тэрыторыі*; | |

| | |
|---|---|
| 6) ***парадкавыя*** лічэбнікі дапасуюцца ў родзе, ліку, склоне да назоўнікаў: | *другі раз*, *шостая сустрэча*, *дзясятае выступленне*. |
| ***Зборныя*** **лічэбнікі спалучаюцца з назоўнікамі:** | |
| 1) якія з’яўляюцца назвамі **асоб мужчынскага полу**:<br>2) якія з’яўляюцца назвамі **маладых істот**:<br>3) якія маюць толькі форму **множнага ліку**:<br>4) якія перайшлі з разраду прыметнікаў:<br>5) ***людзі***, ***дзеці***, ***коні***, ***гусі***, ***свінні***:<br>6) з асабовымі займеннікамі: | *двое сыноў*, *трое сяброў*, *чацвёра студэнтаў*;<br>*пяцёра качанят*, *шасцёра шчанят*;<br>*трое нажніц*, *чацвёра сутак*;<br>*двое вартавых*, *сямёра паляўнічых*;<br>*двое людзей*, *трое коней*, *чацвёра гусей*;<br>*нас трое*, *вас шасцёра*. |